**КАВАЛЁВА І.Я.**
Мінск, БДУ

# ДА ПЫТАННЯ АБ ІДЭНТЫФІКАЦЫІ СКЛАДАНЫХ СЛОЎ ТЫПУ «АСНОВА+АСНОВА»

Праблема ідэнтыфікацыі складанага слова з'яўляецца адной з актуальных праблем беларускага мовазнаўства на сучасным этапе. Імкненне да больш дакладнага выяўлення правіл словаскладання і да ўсебаковага апісання тыпаў і мадэлей складаных слоў застаецца ў цэнтры ўвагі даследчыкаў. У навуковай літаратуры адсутнічае адзіны падыход да вызначэння спосабаў утварэння складаных слоў і, разам з тым, адзіны статус іх структурных кампанентаў. Так, складаныя словы кваліфікуюцца як «адзінкі, утвораныя шляхам складання слоў (уласна словаскладанне) і складання асноў (асноваскладанне)» [1, с. 515]. У навуковых працах многіх беларускіх даследчыкаў (А.А. Лукашанец, С.С. Клундук, Л.А. Гадуйка і інш.) знайшла адлюстраванне класіфікацыя спосабаў утварэння кампазітаў, прапанаваная А.І. Маісеевым, які вылучае ***словаскладанне***, ***асновасловаскладанне*** і ***асноваскладанне*** [2, с. 117–118]. Даныя спосабы ўтварэння складаных слоў можна праілюстраваць наступнымі мадэлямі: 1) **слова+слова**: *аграном-практык, больш-менш, направа-налева, ягада-рабіна;* 2) **аснова+слова**: *агніста-зялёны, літаратурна-мастацкі, райцэнтр, узаемаадносіны, шклозавод*; 3) **аснова+аснова**: *белалобы, вокамгненна, даўганосы, драбналессе, красамоўства, чарнасліў, шырокалістоўны* (тут і далей прыклады з беларускай мастацкай літаратуры).

Аднак пры дэталёвым аналізе моўнага матэрыялу высвятляецца, што некаторыя ўтварэнні могуць быць аднесены як да словаскладання, асновасловаскладання, так і да асноваскладання, параўн.: *агульнанародны, вадасховішча, вершаскладанне, шматабзацальны* і інш. Другі кампанент такіх утварэнняў можна разглядаць як аснову: *народны* < *народ*, *сховішча* < *схаваць, складанне* < *складаць, абзацальны* < *абзацаць* і як асобнае слова: *народны, сховішча, складанне, абзацальны*. Неадназначны статус падобных кампанентаў падкрэслівае дыфузнасць межаў паміж вылучанымі тыпамі і вядзе да неадназначнасці вылучэння словаўтваральных мадэлей па часцінамоўнаму крытэрыю.

У гэтым артыкуле мы прадставім асноўныя прынцыпы, на падставе якіх выбраныя намі з беларускіх мастацкіх твораў кампазіты належаць да тыпу **«аснова+аснова»**.

Асноўным крытэрыем аднясення кампазітаў да тыпу «аснова+аснова» з'яўляеца несупадзенне іх кампанентаў з самастойнымі слоўнымі адзінкамі, параўн.: *аднавясковец < адн*, вясковец*, канакрад < кан*, крад*, камбрыг <*



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

*кам*, брыг**. Аналіз фактычнага матэрыялу дазволіў выявіць, што ў якасці складанняў тыпу “аснова+аснова” выступаюць наступныя лексічныя адзінкі.

1) Кампазіты, словаўтваральнай базай якіх з’яўляецца атрыбутыўнае словазлучэнне. У выніку “сцяжэння” азначальнага кампанента (прыметніка, займенніка, парадкавага лічэбніка) з азначаемым (назоўнікам) узнікаюць адзінкі тыпу: *аднавясковец*, *аднакурснік*, *аднапакаёўка*, *вузкакалейка*, *пятнаццацігоддзе*, *сямігодка*. Варта падкрэсліць, што такія кампазіты ў якасці словаўтваральнай базы маюць як свабоднае словазлучэнне: *высакароднасць < высокі род, агульнаадукацыйны < агульная адукацыя, даўганосы < доўгі нос, вадаправод < праводзіць ваду, трыццацiскладовы < трыццаць складоў, шматзначны < шмат значыць,* так і несвабоднае словазлучэнне: *белагвардзейскі < Белая гвардыя, навагодні < Новы год, чырвонаармейскі < Чырвоная Армія* і інш. Сярод апошніх вылучаецца група складанняў, утвораных на базе устойлівых словазлучэнняў тапанімічнага характару: *паўночнаафрыканскі < Паўночная Афрыка*, *заходнебеларускі < Заходняя Беларусь, сярэднедняпроўскі < Сярэдняе Падняпроўе*, *чарнаморскі < Чорнае мора*, *Нова-Ерусалімскі < Новы Ерусалім* і інш.

2) Складаныя назоўнікі з другім кампанентам – аддзеяслоўным назоўнікам, які не суадносіцца з самастойна ўжываемым словам: *аднадумец < думец*, самагубства < губства**, або з аддзеяслоўным назоўнікам, суадносным з самастойным словам, з нулявым суфіксам: *бамбавоз, буралом, вадаспад, громаадвод, дымаход, сенажаць, шкурадзёр* і інш.

3) Складаныя прыметнікі з другім кампанентам – дзеепрыметнікам і аб’ектнымі адносінамі паміж кампанентамі: *зубаапрацоўчы, ільнопрадзільны, лесагандлёвы* і інш.

4) Лексічныя адзінкі, утвораныя на базе кампазітаў: *асфальтабетонны < асфальтабетон, велікадушнасць < велікадушны, зларадства < зларадны, татара-мангольскі < татара-манголы, самавольнічаць < самавольны, жывапісны < жывапіс, ціхамірна < ціхамірны, злоўжыванне < злоўжываць, дзетдомавец < дзетдом* і інш.

5) Складаныя назоўнікі, кампаненты якіх карэлююць з суб’ектам і прэдыкатам у якасці самастойных адзінак: *вадаспад < вада спадае, крыгаход < крыгі ходзяць* і інш.

6) Складаныя назоўнікі з кампанентамі – скарочанымі асновамі: *выканком, калгас, паўпрэдства, сельмаг,* у тым ліку і літаральнымі скарачэннямі: *аблана, райза* і інш.

7) Лексічныя адзінкі з кампанентамі – каранёвымі марфемамі іншамоўнага паходжання, паколькі яны, як правіла, не ўжываюцца самастойна: *аграном, стэтаскоп, этнаграфічны, фатаграфаваць* і інш.

8) Лексічныя адзінкі, якія на сучасным этапе разглядаюцца як простыя словы, але не страцілі генетычную сувязь з суадноснымі лексічнымі адзінкамі, якія паслужылі базай іх утварэння: *сёння < сяго дня, мядзведзь < мёд есці* і інш.

9) Лексічныя адзінкі, першы кампанент якіх можа кваліфікавацца як самастойнае слова (часцей за ўсё нязменнае), паколькі, па-першае, мы не



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.

To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

вылучаем асобна групу “слова+аснова”, па-другое, аналізуемы кампанент не скланяецца, з’яўляецца адначасова і словам, і асновай: *мімалётны, мімаходзь, шматабяцальны, супрацьпаветраны, уласнаручна, штодзённы* і інш.

10) Лексічныя адзінкі, утваральнай асновай якіх служаць асобныя словы: *лапавухі < лапы, вуха, лянiва-сонечны < лянівы, сонца,* у тым ліку і асабовыя імёны: *Лібава-Роменскі < Лібава, Ромны, Тройца-Сергіеўскі < Тройца, Сергій, Аршанска-Магілёўскі < Орша, Магілёў* і інш.

Як ілюструюць прыклады, кампазіты, якія належаць да тыпу «аснова+аснова», утвараюцца не толькі шляхам складання асноў, параўн.: *буралом, грэчкасей, плытагон, хмарачос*, але і з дапамогай іншых традыцыйна вылучаемых спосабаў словаўтварэння, такіх як ***афіксацыя****: пустамеля, кніганоша, кулямётчык*; ***канверсія****: правафланговы, аднаногі* і ***скарачэнне****: валвыканкам, лясгас*.

Атрыманыя ў выніку аналізу фактычнага матэрыялу даныя дазваляюць канстатаваць, што корпус складанняў тыпу «аснова+аснова» аб’ядноўвае найбольшую колькасць лексічных адзінак.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Беларуская мова : Энцыклапедыя / Беларус. Энцыкл. ; пад рэд. А. Я. Міхневіча ; рэдкал.: Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭН, 1994. – 655 с.
2. Моисеев, А. И. Основные вопросы словообразования в современном русском литературном языке : учеб. пособие / А. И. Моисеев. – Л. : Изд-во ЛГУ, 1987. – 206 с.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm